**Источник: «Рэспубліка» - 2014-03-06**

# І дух яе жыве

Вечарына «...Галоўнае ў жыцці — жыццё», прысвечаная 85-годдзю з дня нараджэння вядомай беларускай паэтэсы Еўдакіі Лось, адбылася ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН.

Паэты і пісьменнікі, прыхільнікі творчасці Еўдакіі Лось адзначалі, што гэтай жанчыне-паэтцы, упэўненай і ўстойлівай, як само жыццё, наканавана было захаваць і пранесці праз усе выпрабаванні вечныя духоўна-эстэтычныя ідэалы прыгажосці, дабрыні, спагады, а таксама веры, любові і надзеі.

У свой час Уладзімір Караткевіч назваў Еўдакію Лось «жытніцай» — «істотай з беларускага фальклору, якая жыве ў каласах і памірае толькі тады, калі апошні чалавек сабраў свой ураджай. Яна дапамагае ўсім, і дух яе жыве нават у тым пучку жыта, які выносяць вясною на Юр'я ў поле». «А за добрае стаўленне да мяне і заступніцтва, — пісаў Уладзімір Караткевіч, — я, калі напішу якую-небудзь паэму, прысвячу яе табе...»

Арганізатары вечарыны падрыхтавалі выставу «Зараз выкажу, выпею сонца-душу», прысвечаную творчай спадчыне Еўдакіі Лось. У экспазіцыі можна ўбачыць усе яе прыжыццёвыя зборнікі — ад «Сакавіка» (1958) да «Лірыкі ліпеня» (1977), а таксама апошнія перавыданні і сучасныя публікацыі яе твораў. Прадстаўлены не толькі вершы і паэмы, але і апавяданні, замалёўкі. Яе творы перакладаліся на розныя мовы свету. З гэтымі перакладамі можна пазнаёміцца на выставе, а таксама ацаніць перакладчыцкі талент самой Еўдакіі Лось.

*Дзмітрый Махоткін*